Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая ГАЗЭТА

ПАНЯДЗЕЛАК
28 ЛІСТАПАДА 1932 г.
№ 262 (3631)

ТЭЛЕФОНЫ:
Адказн. рэдактара 3-80
Адказн. сакратара 4-78
Сэктароў . . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 1 руб.
3 „ . . . 3 „
6 „ . . . 6 „
Падпіска прымаецца: выключна на пошце і лістаносцамі.
Рукапісы не звяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок нонпарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнт аб згубе 2 руб.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўч. Камітэту БССР аб тэрміне скліканьня і парадку дня IV сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Склікаць IV сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР X скліканьня 3 студзеня 1933 году ў г. Менску.

2. Зацьвердзіць наступны парадак дня IV сэсіі:

1) Кантрольныя лічбы народнай гас падаркі БССР на 1933 год. Дакладчык —старшыня Савету Народных Каміса раў БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕД.

2. а) Дзяржаўны бюджэт на 1933 год.

Дакладчык—тав. А. І. ХАЦКЕВІЧ.

б) Сэдаклад Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР па дзяржаўным бюджэце на 1933 год.

3. Даклад аб пасеўных плянах на 1933 год і аб практычнай рабоце ў барацьбе за ўзьнікненьне ўраджайнасьці.

Дакладчыкі—т.т. РАЧЫЦКІ, МАСЮКОЎ і ТАМАШЭЎСКІ.

4. Зацьверджаньне важнейшых пастаноў, прынятых за час ад III сэсіі ЦВК БССР.

Дакладчык—т. М. П. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

27-га лістапада 1932 г.
гор. Менск.

Посьпех мясазагатовак—перамога сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Больш двух месяцаў прайшло з часу апублікаваньня пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) ад 23 верасьня па пытаньні аб мясазагатоўках. Ня следзячы на тое, што прайшло ўжо ⅔ кварталу, што ўрад два разы зьмяняў плян для калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў і даў цэлы рад пільгак—БССР плян IV кварталу цыкон вае вельмі нездавальняюча. Паводле даных на 20 лістапада выканана ўсяго 24,9 проц. Калгасьнікі далі 4 проц. за даньні аднаасобнікі—13,8 проц. наогат СТКФ—толькі 47,7 проц.!

Чаму-ж утварылася такая вялікая за пазычанасьць дзяржаве—рабочым цэнтрам? Калі прыняць пад увагу, што новы закон быў сустрэнуты ўсеагульным ухваленьнем з боку працоўных беднякоў і сераднякоў, зразуметы як новы акт ураду, накіраваны на далейшы ўздым жывёлагадоўлі і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў,—дык застаецца безагаворачна прызнаць галоўнай прычынай ганебных тэмпаў жывёлазагатовак тое, што пераважная большасьць раёнаў пастанову СНК і ЦК папулярызавалі недастаткова, што мясавая палітычная і арганізацыйная работа была і зьяўляецца слабай. Партарганізацыі і саветы, папулярызуючы (больш правільна—слаба папулярызуючы) апошнее рашэньне СНК і ЦК, ня выкары сталі яго як магутны ўродак мабілізацыі мас на канчатковае вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі. У многіх мясцох можна нагледаць факты, калі калгасьнікам і працоўным аднаасобнікам ня зусім вядома, напрыклад, тое, што мяса можна здаваць жывой вагой любой жывёлай, што загатоўкі маюць бязумоўную сілу падатку. Мала прапаганды вядзецца на мясцох вакол пытаньня аб тым, што парадак мясазагатовак гэтага году дае вялікія магчымасьці для правільнага плянаваньня жывёлагадоўчай гаспадаркі калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Трэба адкрыта сказаць, што на мясцох недастаткова даваўся адпор кулацкай агітацыі і апартуністычнай практыцы некаторых раённых загатоўчых апаратаў. Кулак і яго агенты ад'ямкнуцца ўнушыць бедняку і серадняку, што апошнее рашэньне ўраду—гэта пачатак цэлай сэрыі падатковых абавязацельстваў, што плян не канчатковы і будзе відазьменены ў бок павялічэньня. Кулак агітуе за продаж мяса прыватніку, спэкулянту і перакупшчыку, падбухторваючы ся лян разбураць жывёлагадоўчыя гаспадаркі.

Правільнае разуменьне ўсіх прычын адставаньня, а значыць іх безадкладнае зьнішчэньне, патрабуе таго, каб былі выкрыты ўсе буйныя і дробныя недахопы. Позна былі разасланы абавязацельствы раёнам. Пляны здачы мяса ня былі ў парадку папуляризацыі даведзены да кожнага калгаса і двара аднаасобніка. Раёны ня здолелі пашырыць посьпеху МТФ, выканаўшы плян IV кварталу больш чымсь на 100 проц. Ці трэба даводзіць, што сацыялістычны сэктар, посьпехі якога з кожным днём узрастаюць, павінен быў з самага пачатку арганізаваць грамадзкі буксір, бо адставаньне аднаасобнікаў было зьявай усіх трох кварталаў 1932 году.

Значыць, адна з важнейшых і чарговых задач заключаецца ў тым, каб пакрыць запазычанасьць папярэдніх кварталаў і напружаньнем усіх сіл, арганізацыяй сацыялістычнага буксіру дамагчыся сваячасовага выкананьня пляну IV кварталу—пляну забясьпечаньня мясам важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне пляну IV кварталу па мясе, посьпех вырашэньня буйнейшай задачы, пастаўленай партыяй, задачы ўздыму жывёлагадоўлі будзе забясьпечаны толькі пры жорсткай клясавай барацьбе з кулаком, яго агентамі і апартуністычным скажэньнем лініі партыі. Мацней націск на кулака, больш непрымірымасьці да ўсякіх антыпартыйных тлумачэньняў аб нерэальнасьці і непасільнасьці вырашыць мясную праблему.

Да канца IV варталу—1 месяц. Забясьпечыць выкананьне ўсяго пляну, стварыць продпасылкі для посьпяховай рэалізацыі рашэньня СНК і ЦК ад 23 верасьня—значыць паставіць і вырашыць цэлы рад пытаньняў, у сваёй суме накіраваных на вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі. Паўстаюць ва ўвесь рост карэнныя прынцыповыя пытаньні арганізацыі сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

У якасьці аднаго з важнейшых трэба паставіць пытаньне аб умацаваньні сыстэмы і апарату Заготжывёлы. Сыстэма за 1932 год у асноўным ня дрэнна справлялася з арганізацыяй утасных баз для захаваньня жывёлы (41 утасная база—27 арэндаваных). Але становішча, у якім яны знаходзяцца, паказваюць жадаць шмат лепшага. Некаторыя работнікі разглядаюць базы, як часовыя пункты. Значыць па іх думцы няма сэнсу трацціцца на абсталяваньне, на захаваньне правіл зоа вэтэрынарыі, не патрэбны капітальныя затраты. Заготжывёла павінна ў 1933 годзе забясьпечыць капітальны рамонт у 22 раёнах, будаўніцтва новых 13 баз і заканчэньне 5 пачатых (Полацак, Пухавічы, Касьцюковічы, Крычаў і Ельск). РВК павінны пайсьці насустрач мясцовым аддзяленьням у падшуканьні памяшканьняў. Перад Наркамцяжпромам павінна быць пастаўлена задача поўнага забясьпечаньня баз вагавай гаспадаркай (а базы-ж з-за адсутнасьці вазовых вагаў дрэнна падрыхтаваны да прыёмкі жывёлы). Наркамзем абавязаны безадкладна распрацаваць і цьвёрда праводзіць у жыцьцё правілы прыёмкі, захаваньня і транспартаваньня жывёлы ў поўнай аднаведнасьці з патрабаваньнямі вэтэрынарыі і задачы барацьбы са спратамі вагі. Тэхніка мясазагатовак складаная і спэцыфічная. Тэму на пытаньне кадраў павінна быць зьвернута асаблівая ўвага. Трэба распрацаваць рад практычных мерапрыемстваў па замацаваньні спэцыяліста, якія шмат год працуюць па мясе, вылучаць і рыхтаваць новыя кадры. Не апошнім стаіць пытаньне аб сыстэме кіраўніцтва і павышэньні ўзроўню дабрабыту работнікаў.

Барацьба са спратамі ў сельскай гаспадарцы займала і займае шмат увагі партыі і ўраду. Гэтая барацьба ў жывёлагадоўлі павінна праходзіць ня толькі ў самой гаспадарцы, але і на працягу ўсяго працэсу загатовак. На колькі дрэнны догляд за жывёлай у дарозе можа дрэнна адбіцца на вазе служыць факт адпраўкі 14 лістапада 91 галавы дробнай рагатай жывёлы Мсьціслаўскай канторай. Пры здачы мясакамбінату спрата дасягнула 800 кілёграмаў. Падобнага роду факты ёсьць і ў Чашніцкім раёне. Адсюль задача—палепшыць якасьць догляду за жывёлай на базах і ў дарозе. Трэба безадкладна ліквідаваць сустрэчныя перагоны і перавозкі. У раёне трэба пакінуць, як правіла, адну прыёмную базу, разьмяшчаючы яе прыстасоўна да чыгункі. У мэтах ліквідацыі лішніх перагонаў у зімовы час—трэба безадкладна заняцца пытаньнем арганізацыі забойных пунктаў у глыбінных раёнах для дробнай рагатай жывёлы і сьвіней. Не дапускаць перагонаў буйнай рагатай жывёлы больш чым на 40-50 кілёмэтраў. Мы думаем, што Белмясапрамтрэст безадкладна зойме пытаньнем арганізацыі забою і збору водкідаў.

Правільнае вядзеньне загатовак жывёлы высоўвае пытаньне аб стварэньні кармовай базы для загатоўчых арганізацый. У 1932 годзе сыстэма Заготжывёлы з 3790 га сенажаці скасіла і ўбрала 1933 та. Толькі на 50 проц. за гатоўка была забясьпечана грубымі кармамі. Яшчэ горш была пастаўлена справа з канцэнтраванымі кармамі. Гарсаветы і РВК павінны неадкладна закончыць адвод вучасткаў для пасеву. Заготжывёла павінна забясьпечыць іх поўнае асваеньне. У 1933 годзе мець улясную харчовую базу—такая задача загатоўчай сыстэмы.

Трэба чым хутчэй урэгуляваць пытаньне загатовак у раёнах, дзе ёсьць некалькі загатоўцаў. Скрозь і ўсюды ў раёнах парушаюцца канвэнцыйныя цэны. Са выдзіўляючым спакоем, граючы ролю назіральнікаў, канвэнцыйныя бюро дапускаюць парушэньне савецкай палітыкі цэн, спэкуляцыю і ажыятаж. Посьпех загатовак у вялікай ступені вызначаецца чоткай работай канвэнцый, барацьбой з ажыятажам і са спэкуляцыяй.

Пытаньне аб загатоўках мяса ва ўмовах барацьбы за сацыялістычную рэканструкцыю сельскае гаспадаркі зьяўляецца пытаньнем вялізарнай гаспадарча-палітычнай важнасьці.

Пятнаццімесячны плян, плян IV кварталу павінен быць выкананы ў вызначаныя ўрадам тэрміны—гэта задача кожнага камуніста, кожнага члена сельсавету.

Пастанова ЦК Усе КП(б)

1. За ашуканства партыі, якое выявілася ў прадстаўленьні заведамга хлусьлівых даных, зьмяншаючых абожжавыя рэсурсы вернясаўгасаў, — выключыць з партыі дырэктара Украінска-Крымскага вернятрэсту *Буркова*.

2. Дазволіць Наркамсаўгасу даць Буркову ў выглядзе іспыту работу ў якасьці дырэктара аднаго з саўгасаў.

3. Дапусьціць падачу Бурковым праз год заявы аб прыёме ў партыю нанава.

ЦК УсеКП(б)

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б ад 10-XI-32 г.

Па справе адстраненьня ад працы т. Дзічкоўскага намесьнікам упаўнаважанага Наркамцяжпрому тав Сакаленкам

Заслухаўшы вывады камісіі па расьследваньні справы адстраненьня ад работы дырэктара заводу імя Варашылава т. Дзічкоўскага,—Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Загад т. Сакаленкі ад 3 лістапада гэтага году аб адстраненьні ад работы без рашэньня ЦК і гаркому партыі дырэктара заводу імя Варашылава т. Дзічкоўскага, які зьяўляецца членам ЦК партыі і членам бюро гаркому КП(б)Б, лічыць арганізацыйна неправільным, на што ЎКАЗАЦЬ тав. Сакаленку.

2. Тав. Дзічкоўскаму за парушэньне прынцыпаў адзіначальля абвясьціць суровую вымову.

3. Даручыць партячэйцы заводу імя Варашылава растлумачыць і прапрацаваць данае рашэньне Сакратарыяту на ячэйцы.

4. Аддзелу Кадраў ЦК КП(б)Б разам з т. Сакаленкам у 3-дзённы тэрмін узмацніць Белмэталяаб'яднаньне работнікамі.

Менскаму гаркому КП(б)Б зараз-жа камандыраваць на работу ў Белмэталяаб'яднаньне т. Айзмана.

Бульба—Ленінграду

Рапартаваць аб сканчэньні адгрузкі—

баявая задача ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый БССР

Быхаўскі раён перавыканаў плян адгрузкі

ЦК КП(б)Б—т. т. Гікало, Шаранговічу, СНК т. Бэнэку, газэтам „Звязда" і „Савецкая Беларусь"

Пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, у выніку разгорнутай масавай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў-аднаасобнікаў, пры рашучым націску на кулацка-заможныя гаспадаркі — Быхаўскі раён 23 лістапада перавыканаў заданьне па адгрузцы бульбы ў 4500 тон. Адгружана 4537 тон. Адгрузку працягваем.

Сакратар райкому КП(б)Б Канавалаў.
Старшыня РВК Князеў.
Райкантора ЛСТ Міронаў.

Множыць пачын

БАБРУЙСК. Калгас «Ударнік», Старцаўскага сельсавету, паказаў баявыя прыклады ў справе выкананьня сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Апрача таго, што калгасам выкананы плян бульбазагатовак на 105 пр., калгасьнікі на сваім апошнім сходзе, абгаварыўшы пытаньне аб адгрузцы бульбы Ленінграду, дабраахвотна з уласных рэсурсаў здалі 1 тону бульбы.

Асабліва актыўна ўдзельнічалі ў здачы бульбы калгасьнікі ПЕЧАНЬ Я., Сьвірка Я., Батура Х., Нікіфараў В. і інш.

Калгасьнікі калгасу «Ударнік» зьвярнуліся з заклікам да суседніх калгасаў пасьледваць іх прыкладу.

(БЕЛТА).

Адклікаць Бяляўскага Сямёна са складу сельсавету, як клясава-варожага элемэнта

(Ад нашага бабруйскага карэспан-дэнта).

Мішкаўскі сельсавет знаходзіцца ў глыбокім прарыве па выкананьні пляну бульбазагатовак. Прычына гэтаму — апартуністычная бязьдзейнасьць сельскага савету. Рад членаў сельсавету, на чале са старшынёю Белягавым, праводзіць яўна кулацкую практыку, бяручы пад сваю абарону кулацка-заможныя гаспадаркі, ігнаруючы правядзеньне масавай работы сярод бяднякоў-серадняцкага сялянства.

Яркім носьбітам гэтай кулацкай практыкі зьяўляецца член сельсавету вёскі Цэйкавічы — Бяляўскі Сямён. Замест таго, каб шырока растлумачыць бяднякам-серадняцкаму сялянству вёскі сутнасьць неабходнасьці выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай і арганізаваць бяднякам-серадняцкае сялянства на здачу рашучага адпору кулацка-заможнай частцы вёскі, гэты кулак падпявала заключае блёк з кулакамі і заможнікамі—Бяляўскім Сяргеем, Шчэрбічам і інш.

Пянствуючы і вядучы дружбу з заможнікамі, Бяляўскі становіцца на шлях яўнага зрыву выкананьня пляну загатовак. Пры абгаварэньні пляну на агульным сходзе сялян вёскі Цэйкавічы, Бяляўскі выступае з кулацкімі дабадамі аб тым, што плян, які даведзены да вёскі, надзвычайна вялікі, што бульба не ўрадзіла і т. д. Калі гэтая спроба ня мела посьпеху і плян быў прыняты, Бяляўскі стараецца папасьці ў камісію садзейнасьці загатоўкам і там праводзіць сваю кулацкую работу.

Ён узяў пад сваю абарону кулакоў Бяляўскага Сяргея, Шчэрбіча і іншых, даваў няправільныя зьвесткі сельсавету аб тым, што тэтыя кулакі выканалі даныя ім цьвёрдыя заданьні, «што ўсё па яго вучастку пастаўлена добра».

І калі ў апошнія дні ў вёсцы праводзілася брыгадзірамі райкому і райвыканкому праверка выкананьня пляну загатовак бульбы, дзе пастала пытаньне аб выкрыцьці кулацкай дзейнасьці Бяляўскага, ён, каб і тут перашкодзіць правядзеньню праверкі, ад праверкі адмовіўся, заявіўшы:

— Мяне ніхто ня мае права правяраць. Няхай прыходзіць сам старшыня сельсавету або ДПУ. Ён спадзяваў ся, што старшыня сельсавету, які сам папурае кулацкай дзейнасьці, возьме яго пад сваю абарону.

Зараз, калі ўся гэта кулацкая дзейнасьць Бяляўскага выкрыта, сельскі савет ня прымае ніякіх мер. Ён і ня думае выводзіць кулацкага агента Бяляўскага са складу сельсавету, ня думае мабілізаваць на гэтым факце ўвагу бяднякам-серадняцкага сялянства вёскі Цэйкавічы і ўсяго сельсавету з тым жаб у корані прасекчы падобную дзейнасьць.

Бяляўскаму няма месца ў савецкім савеце. Бяднякам-серадняцкае сялянства вёскі Цэйкавічы павінна паправаваць адкліканьня яго са складу сельсавету.

Гэты агент кулака павінен быць пры цягнуты да самай суровай адказнасьці. Разам з гэтым, адказным органам трэба зацікавіцца ўсёй дзейнасьцю Мішкаўскага сельсавету, на чале з яго старшынёю Белягавым.

А. Дамброўскі.

Адгружана па БССР бульбы Ленінграду

(у тонах).

	за дзень	в пачатку кампаніі	процант выкананьня пляну
На 27 лістапада	1.930	186.935,6	97,8

Ельскі раён выканаў плян

ЕЛЬСК. (Па тэлеграфе ад наш. кар.). Баявое заданьне па адгрузцы бульбы пралетарам гор. Леніна ў 1130 тон выканана.

Гэту перамогу раён дасягнуў дзякуючы мабілізацыі шырокіх мас калгасьнікаў і беднякоў-сераднякоў аднаасобнікаў на тэрміновае сканчэньне адгрузкі, на фарсаваньне тэмпаў буль базагатовак.

ГЕРАСІМЕНКА.

Заданьне выканана

МАЗЫР. Плян адгрузкі бульбы Ленінграду ў 28.000 цэнтнэраў на 24-е лістапада перавыкананы. Адгружана 28.641 цэнтнэраў — 102,3 проц. заданьня. Адгрузка працягваецца.

(БЕЛТА).

У падарунак Ленінграду

ЕЛЬСК. Калгасы Качышчанскага сельсавету «Рэвалюцыя», імя Сталіна, імя Чарвякова і імя Калініна, улічваючы важнасьць свячасовай адгрузкі бульбы пралетарам Ленінграду, адгрузілі звыш пляну 4,75 тоны бульбы.

Я. З.

Здаюць бульбу звыш пляну

СЛУЦАК. (Наш кар.). Рад калгасаў раёну здаюць (прадаюць) дзяржаве бульбу звыш цэнтралізаваных плянаў у падарунак ленінградзкім рабочым.

Калгас імя Леніна, Мусіцкага сельсавету здаў 20 цэнтнэраў бульбы звыш пляну.

Калгас «Случ» № 1 здаў звыш пляну 18 цэнтнэраў бульбы.

Калгас «Чырвоны гай» здаў у падарунак ленінградзкім пралетарам звыш пляну 15 цэнтнэраў бульбы.

Гэты ўзорны пачын падхоплены радам іншых калгасаў.

ХАЎКІН.

Лепшым бульбаздатчыкам—прэміі

ЧАВУСЫ. Ня гледзячы на рад ука заньняў з боку райтройкі аб фарсаваньні адгрузкі бульбы Ленінграду, рад сельсаветаў (Прадкаўскі, Пушкаўскі, Дзернеўскі, Прылескі, Асінаўскі і Макрадзкі) ня толькі не ўзмацнілі тэмпы бульбазагатовак, але за апошнія дні зусім спынілі адпраўку бульбы на прыёмачныя пункты.

Разам з гэтым рад калгасаў вёсак, бядняцка - серадняцкіх аднаасобных гаспадарак паказваюць бальшавіцкую работу на адгрузцы бульбы Ленінграду. Яны, выканаўшы свае пляны, адгрузкі ня толькі ня спыняюць, але змагаюцца за агульнае выкананьне пляну сельсаветаў.

За свячасовае выкананьне і перавыкананьне плянаў адгрузкі райтройка прэмявала лепшыя бядняцка-серадняцкія аднаасобныя гаспадаркі вёсак Шаперава і Галачова, Антонаўскага сельсавету прамтаварамі на суму 600 руб. Райтройка даручыла сельсавету і сельСТ разьмеркаваць гэтыя прамтавары паміж лепшымі бульбаздатчыкамі—працоўнымі аднаасобнікамі.

Таксама райтройка выдала ў распаряджэньне раду праўленьняў калгасаў грашовыя прэміі для прэм'яваньня лепшых калгасьнікаў — бульбаздатчыкаў. Прэміі выданы праўленьню калгасу «Кастрычнік» (Антонаўскага сельсавету) ў 150 руб., «Новае жыцьцё» (Самулкаўскага сельсавету) ў 200 руб., імя Дзяржынскага (Мохскага сельсавету) ў 150 руб. і «Кастрычнік» (Кароўчынскага сельсавету) ў 150 руб.

Побач з гэтым райтройка ўстанавіла тры грашовых прэміі у 1000, 900 і 500 руб. для лепшых сельсаветаў, якія перавыкананюць свае пляны адгрузкі.

Б. З-ў.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

Аб узнагародзе тав. Калтунова ордэнам працоўнага чырвонага сьцягу БССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

За ўзорную работу ў галіне выкананьне важнейшага дзяржаўнага заданьня — узнагародзіць Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сьцягу БССР тав. КАЛТУНОВА, 63 г., возчыка калгасу імя Калініна, Літвінаўскага сельсавету Полацкага раёну, арганізатара масавых выездаў калгасьнікаў на лесавазку, у выніку якіх заданьне, дзякуючы ўдарнай працы калгасу і працоўных аднаасобнікаў, выканана.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

СНК БССР—тав. Галадзеду

Пад Вашым кіраўніцтвам і пры аказанай дапамозе з боку партыйных, савецкіх арганізацый БССР, Галоўдартрансам БССР закончана пабудова да дагі ВОРША—МЕНСК у межах заданьня 1932 году.

Акалічнасьці, якія стварыліся, не даюць магчымасьці кіраўніцтву Цэнтрансу асабіста прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцьці ўказанай дарогі і вітаць арганізацыі БССР з новай перамогай на фронце сацыялістычнага будаўніцтва БССР, якія першымі ў Саюзе паказалі набачаныя яшчэ тэмпы на дарожным будаўніцтве.

Час. вык. аб. ЦДОР ЧОРНЫ.

Віцебск і раён—суцэльна-пісьменныя

ВІЦЕБСК. (Наш спэцкор). Горад Віцебск і раён ператвораны ў суцэльна-пісьменныя. На сёньняшні дзень пісьменнасьць працоўнага насельніцтва Віцебшчыны ўзьнята да 99,3 проц.

У сувязі з гэтай перамогай, апрымай пад кіраўніцтвам партарганізацыі, настаўнікі, інструктары-мэтадысты і раённае таварыства «ПН» зьвярнуліся з адкрытым лістом да т.т. ЧАРВЯКОВА, КАВАЛЬЧУКА, ПЛАТУНА, а так сама да Віцебскіх гаркому партыі, гарсавету і гарпрафсавету. У гэтым лісьце асьветнікі Віцебшчыны запэўняюць партыю і ўрад, што ўсе сілы накладуць на ажыцьцяўленьне дырэктыў сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і пастановы СНК БССР аб увядзеньні ўсенавучу малапісьменных.

Асьветнікі ўзялі на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па разгортваньні ўсенавучу. У лісьце асьветнікі падкрэсьліваюць, што за час рэйду, які праводзіцца газэтай «Савецкая Беларусь» Віцебскімі гарпрафсаветам і райКК—РСІ выўлен рад перашкод з боку асобных гаспадарнікаў і фабзаўкомаў у справе ажыцьцяўленьня ўсенавучу малапісьменных. На вышэйшэньне гэтых перашкод мабілізуецца пралетарская грамадзкасьць Віцебшчыны.

АБЛЯЦОЎ.

Узмацніць загатоўкі сартазога насеньня

Поруч з радам іншых мерапрыемстваў вялікае значэньне ў павышэньні ўраджайнасьці адыгрывае ўвядзеньне сартавога насеньня. Паводле пляну ў 1933 годзе у БССР сартавымі культурамі мае быць занята 25.000 га, з кожным-жа наступным годам павінны няўхільна павялічвацца сартавыя пасевы, каб поўнасьцю скончыць сартазьмену ў 1936 годзе.

Ажыцьцяўленьне гэтага адказнейшага мерапрыемства ўпіраецца ў недахват сартавога насеньня. Адсюль асноўная задача раённых арганізацый і сельсаветаў—па-бальшавіцку разгарнуць загатоўкі сартавога насеньня, каб цалкам забясьпечыць выкананьне пляну пасеву чыстасортных культур. Трэба аднак адзначыць, што рад насенкантор Саюзнасеньводу да апошняга часу недаацэньваюць арганізацыі загатовак насеньня сартавых культур.

У выніку поўнай бязьдзейнасьці ряду насенных кантор і мясцовых арганізацый, на 20 лістапада плян па загатоўках аўсу выкананы на 37 проц., ячменю—на 60 проц., гароху белага—12, канюшыны—0,2, лугавых траў—15, гародных кораньплодаў—21, кармовых кораньплодаў—23, сэрадэлі—30, і лубіну—0,3 проц.

Асабліва адстаюць такія раёны, як Полацкі, Лёзьненскі, Пухавіцкі, Шклоўскі, Старобінскі, Капыльскі, Талачынскі. Па Лепельскім, Полацкім і Пухавіцкім раёне, вельмі марудна праводзяцца загатоўкі зярнёвых культур, канюшыны, сэрадэлі і гародніны.

Насенныя канторы паданых вышэй раёнаў працягваюць загатоўкі па прыкладзе мінулага году, калі ўся работа была абязьлічана. Загатоўчыя арганізацыі ня прымаюць практычнага ўдзелу ў загатоўках. Між тым трэба было накіраваць у калгасы сваіх людзей, каб апошнія дапамагі абмалаціць, абвеець патрэбнае насеньне, дапамагчы калгасам прыстасаваць малатарні, арганізаваць пашпартызацыю насеньня (дакладна вызначыць паходжаньне кожнага сорту), дапамагчы здаць (прадаць) насеньне на пункты.

Таксама нічога ня робіцца для стымуляваньня загатовак сартавога насеньня, не праводзіцца выдача збожжа па кантрактацыйных дагаворах.

МТС і іншыя зямельныя арганізацыі раёну вельмі мала цікавяцца пытаньнем загатовак сартавога насеньня. Яны ўвесь час спадзяюцца на завоз насеньня з іншых раёнаў Савецкага Саюзу. Варта адзначыць, што ніводная МТС да гэтага часу не арганізавала збор сартавога насеньня паводле заключаных дагавораў. Ня гледзячы на спрыяючае надвор'е МТС марудзіць з абмалотам.

Трэба пакласьці канец такім ганебным адносінам да загатовак сартавога насеньня. Усе насенныя канторы павінны неадкладна пераключыцца на практычную работу ў правядзеньні загатовак. Усіх, хто разбазарвае насеньне, (калгасы Бабруйшчыны, «Заветы Ільіча» і «Камуніст»), трэба прыцягваць да суровай адказнасьці.

Л. Жарын.

У авангардзе конкурсу друку

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.).

Усесаюзны конкурс, абвешчаны газэтай «Известия», «Соцэкземделие» і «Экономическая жизнь» і інш. на лепшую газэту па выкананьні фінпляну IV кварталу выклікаў новы ўздым актыўнасьці сярод фінармейцаў, рабкораў — ударнікаў Магілеўшчыны. Штодня шматтыражкі, штодзённі прадпрыемстваў гораду ўключаюцца ва Усесаюзны конкурс, бяручы на сябе канкрэтныя абавязацельствы. Газэта «Камунар Магілеўшчыны» з першых дзён абвяшчэньня конкурсу ўзначаліла яго, разгарнуўшы на прадпрыемствах шырокую арганізацыйную работу па ўключэньні ніза вога друку ў конкурс.

«Камунар Магілеўшчыны», уключаючыся ў конкурс, узяў на сябе абавязацельства—штодзённа на сваіх старонках асьвятляць пытаньне барацьбы за фінплян прадпрыемствамі, сельсаветамі, калгасамі, вёскамі раёну. «Камунар Магілеўшчыны» абавязаўся склікаць два раённых зьлёты рабселькораў па пытаньні фінработы, наладзіць выезд выязной рэдакцыі ў сельсаветы з выданьнем на месцы штодзённага бюлетэня. 14 лістапада ў Махаўскі сельсавет ужо выехала выязная рэдакцыя ў складзе 3-х адказных работнікаў рэдакцыі па абожжазагатоўках і выкананьні фінпляну. 15 лістапада РК КП(б)Б, рэдакцыяй «Камунар Магілеўшчыны», райпрафсаветам і рэдакцыяй «Савецкай Беларусі» праведзены зьлёт рэдкалегій шматтыражак, штодзённак, рабкораў — ударнікаў, фінармейцаў, старшынь ФЗМК прадпрыемстваў і ўстаноў гораду. На зьлёце пры сутнічала 230 чал.

Для пасьпяховай рэалізацыі ўмоў конкурсу і забясьпечаньня датэрміновага выкананьня фінпляну, асабліва па рэалізацыі пазыкі і ўлічваючы, што пасьпяховае завяршэньне пазыкі ў значнай меры залежыць ад добрага абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў, «Камунар Магілеўшчыны» з 16 па 26 лістапада аб вясьціў дэкаднік масавай праверкі выігрышаў па пазыках.

Гэта ініцыятыва знайшла жывы водгук і падтрымку з боку рабкораў, фінармейцаў—ударнікаў гораду. На адбыўшымся зьлёце 15 лістапада зьлёт ухваліў ініцыятыву рэдакцыі «КМ» аб арганізацыі дэкаднику і абавязаўся па-баявому правесьці яго ў сваіх прадпрыемствах і ўстановах.

Зьлёт узяў на сябе абавязацельства на працягу 2-х дзён арганізаваць на прадпрыемствах і ўстановах ударныя брыгады з лепшых фінармейцаў — ударнікаў і рабкораў па праверцы выігрышаў, арганізаваць сталы даведак. Для разгортваньня гэтай работы ў падшэфныя сельсаветы, калгасы і вёскі враз свае пэфсвяючыя арганізацыі паслаць брыгады ўдарнікаў фінармейцаў і лепшых рабкораў для наладжаньня выпуску штодзённак і дапамогі мясцовым арганізацыям у разгортваньні работы па праверцы выігрышаў, выкананьні фінпляну IV кварталу і завяршэньні рэалізацыі пазыкі.

Зьлёт абавязаўся сябе ўдарным і абавязаўся да 15 сьнежня поўнасьцю выканаць фінплян IV кварталу, скончыць рэалізацыю пазыкі, афармленьне яе, уважаючы пад непасрэдны нагляд свячасовае гнясеньне гаспадарнікам, ўзноску па пазыках, разгарнуць бальшавіцкую работу па наладжваньні добрага абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў, арганізаваць буксір перадавікоў адстаючым. На кожным прадпрыемстве арганізаваць сыгнальныя пасты друку. Зьлёт выклікаў на сацыялабарніцтва Бабруйскі раён па лепшым правядзеньні Усесаюзнага конкурсу і абраў арбітрам «Савецкую Беларусь».

Рэдакцыяй «К. М.» для пасьпяховага правядзеньня гэтай работы разам з Райфа і райапчадкасай выпрацаваны каляндарны плян работы.

Рад прадпрыемстваў прыступілі да практычнай работы. 17 лістапада адбылася масавая праверка выігрышаў у друкарні імя Молатава, на швэйнай ф-цы. Па друкарні разьвешаны лёзунгі, плякаты аб праверцы, арганізаван стол даведак, па ўсіх цэхах шырока абвешчана аб праходзячай рабоце па праверцы. Тое-ж самае мы маем на швэйнай ф-цы.

17 лістапада, у першы дзень праверкі, у друкарні імя Молатава выйграла 4 чал., па швэйнай ф-цы—8 чал. Гэта ўзьняло новую хвалю актыўнасьці сярод рабочых аб дадатковай падпісцы на пазыку. У правядзеньні гэтай работы ініцыятарамі зьяўляюцца па друкарні фінармейцы Янавіцкі, Стрэльцын, Капан і Друтман, прэм'яваныя за лепшае правядзеньне фінпляну III кварталу. На швэйнай фабрыцы ініцыятарам першага дня праверкі зьявілася піянэр-база 1-й школы на чале з дзяткорам, рэдактарам штодзённкі «Юны політэхнік» т. Малочка.

На сёньняшні дзень уключыліся ва Усесаюзны конкурс шматтыражкі «Чырвонае вераціно», Шоўкавая ф-ка па сваёй цэхавымі і брыгадным штодзённкамі, «Сталінец» (завод імя Сталіна) з заводзкімі штодзённкамі, «Чырвоны валадарэц», швэйная ф-ка з 30 штодзённкамі фабрыкі, «Ударнік палітасьветы», штодзённі хлебазаводу.

Шматтыражка «Сталінец», для мабілізацыі на гэту справу рабочых, рабкораў - ударнікаў 14 лістапада правяла нараду рабкораў і рэдкалегій заводу разам з рабочымі ўдарнікамі. «Сталінец узяў абавязацельства да 15 сьнежня поўнасьцю выканаць фінплян IV кварталу, завяршыць рэалізацыю пазыкі, наладзіць добрае абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў ажыяцыі работу камісій садзейнасьці, практычна і штодзенна дапамагаць ёй у рабоце, дапамагаць праз друк вызначаным спэцыяльным таварышом у справе наладжаньня работы па ліквідацыі запазычанасьці па членскіх узносах: МОПР, Асоавіяхім, ліквідаваць запазычанасьць па прафэсійных і інш. узносах.

Шматтыражка абавязалася вывесьці з прарыву па выкананьні фінпляну ЗРК заводу, сыстэматычна асьвятляючы на старонках газэты работу апошняга ў барацьбе со фінпляну.

Шматтыражка «Чырвонае вераціно», уключыўшыся ў конкурс, абавязалася да 25 лістапада поўнасьцю ахапіць падпіскай на пазыку ўсіх рабочых і служачых фабрыкі і дабіцца

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі—у перадавых радох паходу саветаў за шырспажыў

За ГРАНІЦАЙ

Германія

Урад „моцнай рукі“

БЭРЛІН. 27-XI. Як паведамляюць газэты адным з найбольш мажлівых выхадаў з урадавага крызісу лічыцца ўтварэньне ўраду «моцнай рукі». Паводле паведамленьня «Бэрлінэр Бэрэнцайтунг», Гіндэнбург высоўвае патрабаваньне каб новы канцлер «карыстаўся абсалютна неабмежаваным давер'ем з боку прэзыдэнта і быў у поўнай згодзе з міністрам рэйхсвэру». Паводле вестак газэты новы канцлер павінен дасягнуць згоды з правымі партыямі, а таксама стварыць мажлівасьць адкрыцьця рэйхстагу толькі ўвесну 1933 году, не ўжываючы яго роспуску.

Кандыдатам на пост такога канцлера газэты называюць міністра рэйхсвэра ШЛЕЙХЕРА. Паводле паведамленьня «Форвартс», ШЛЕЙХЕР нібыта зьявіў ужо сваю гатоўнасьць пачаць перагаворы з партыямі з тым, каб за кончыць іх у сярэдзіне гэтага тыдню. Тую-ж вэрсыю паўтарае і «Дэйчэ Альгемэйнэ Цэйтунг», газэта падкрэсьлівае пры гэтым, што выстаўленьне кандыдатуры міністра рэйхсвэру на пасаду канцлера яшчэ больш узмацніе ролю армії ў палітычным жыцьці ГЕРМАНІІ. «Бэрлінэр Бэрэнцайтунг» таксама рашуча выказваецца за ўтварэньне ўраду «моцнай рукі». Газэта раіць новаму ўраду заручыцца ў барацьбе супроць адзінага рабочага фронту безагаворкавым падтрыманьнем з боку нацыянал-сацыялістаў.

Забарона „Ротэ Фанэ“

БЭРЛІН. 27-XI. «РОТЭ ФАНЭ» ізноў забаронена на тры дні. Аб прычынах забароны нічога не дазволена друкаваць. «Бэрлін Ам Морген» піша: «У момант прызначэньня новага ўраду, задачаю якога будзе яшчэ з большаю сілай выступіць супроць працоўных, 860 тысяч камуністычных выбаршчыкаў Бэрліну пазбаўлены мажлівасьці дазнацца думкі аб падзеях машнейшай партыі сталіцы. Тыя хто спадзяецца зламаць узрастаючае супрацьціўленьне пралетарскіх мас супроць фашыстоўскае дыктатуры забаронамі пралетарскага друку, глыбока памыляюцца. 860.000 пралетарскіх выбаршчыкаў забаранішь нельга. Забаронена таксама на два тыдні пралетарская «Арбайтэр Ілюстрыртэр Цайтунг». Газэта забаронена за надрукаваньне вершу Вайнэрта, у якім углядае абразу рэйхсвэру. У памяшканьні Марксыстскага рабочага Унівэрсытэту паліцыяй праведзены двухгадзінны вобыск. Пасьля зусім бесплённага вобыску паліцыя арыштавала 11 чалавек у тым ліку відомага пісьменьніка ЛЮДВІГА РЭНА. Многа з арыштаваных паліцыя аднак прымушана была хутка вызваліць.

Савецкі Саюз—лепшы даўжнік

БЭРЛІН. 26-XI. На гадавым чарговым агульным сходзе акцыянэрнага германскага прадпрыемства «Гумбольд-Дэйчэ Маторэн Г.», які адбыўся ў Кельні, старшыня праўленьня, вядомы буйны прамысловец Клекнэр, аднаваючы на запытаньні заявіў, што фірма атрымала буйны заказ ад Савецкага саюзу. Клекнэр падкрэсьліў далей, што «ні адзін вэксэль Савецкага саюзу ня быў апратэставаны» і што «Савецкі саюз адносіцца да лепшых даўжнікоў». Клекнэр выразіў далей надзею што яго фірма атрымае у далейшым буйныя савецкія заказы.

Камуністы ў рэйхстаг зь маюць 101 мандат

БЭРЛІН. 26-XI. (Улас. кар. «Известий»). У выніку праверкі выбараў у Дзюсельдорфскай акрузе аказалася, што кампартыя мае яшчэ адзін мандат. Такім чынам лік дэпутатаў у новай камуністычнай фракцыі рэйхстагу даходзіць да 101.

„Данцыг— Польшчы“?

БЭРЛІН 26-XI. Вялікае ўзбуджэньне ў германскім друку выклікала прамова польскага генэральнага камісара ў Данцыгу Папэ 14 лістапада на сходзе польскай калёніі ў Данцыгу з прычыны гадавіны незалежнасьці Польшчы. Згодна паведамленьня данцыскага карэспандэнта «Дойч Альгемэйнэ Цэйтунг», Папэ ў сваёй прамове, зварочваючыся да ўдзельнікаў сходу, сказаў: «кожны з вас павінен заклікаць зрабіць вялікую справу,—зьвярнуць Данцыг Польшчы. Польшча мае права на Данцыг і, як магутная дзяржава, Польшча не пазволіць пазбавіць яе гэтага права. Польшча ведае шлях у Данцыг і нікому не дазволіць адхіліць сябе з гэтага шляху. Таксама ніхто ня можа зрабіць Польшчы якія-не будзь указаньні адносна Данцыгу.

***

БЭРЛІН. 26-XI. Выступленьне польскага генэральнага камісара ў Данцыгу Папэ прывяло да новага, рэзкага абвастрэньня польска-германскіх адносін. Германскі друк расцэньвае выступленьне Папэ як правакацыю і патрабуе рашучага ўмяшаньня Лігі нацый, а таксама адкліканьня Папэ са сваёй пасады.

Польшча

Пад націскам рабочых

ВАРШАВА 27-XI. У Лодзі выбухнула адзадзённая забастоўка тэкстыльшчыкаў у знак пратэсту супроць масавых звальненьняў і скасаваньня калдагавору. Забастоўка афіцыйна абвешчана фашысцкім прафсаюзам, які быў прымушаны да гэтага кроку вялікім незадавальненьнем рабочых палітыкай прадпрыемцаў.

Масавыя звальненьні рабочых

ВАРШАВА 27-XI. У сувязі з абвастрэньнем эканамічнага крызісу на польскіх прадпрыемствах працягваецца масавае звальненьне. З Верхняй Сілезіі паведамляюць аб далейшых звальненьнях рабочых на шахце «Рых тэр» у Семінавіцах, а таксама на металюргічным заводзе «Фэрум». Дырэкцыя тэкстыльнай фабрыкі ў Заверце (Дамброўскі басэйн) абвясьціла аб маючым наступіць звальненьні 3000 рабочых. У сувязі са звальненьнем 5.400 рабочых на тэкстыльнай фабрыцы «Шайблер і Громан» у Лодзі адбылася дэлегацкая канфэрэнцыя рабочых тэкстыльных прадпрыемстваў. Рэвалюцыйная прафарганізацыя заклікае да абвяшчэньня ўсеагульнай забастоўкі лодзінскіх рабочых у знак пратэсту супроць масавых звальненьняў і зьніжэньня зарплаты.

„Глос паранны“ аб польска-германскіх адносінах

ВАРШАВА 27-XI. У сувязі з берлінскай паездкай Шэмбэка, польскі друк ажыўлена абмяркоўвае праблему польска-германскіх адносін. «Глос паранны» піша: «Міністр Бэк выступіў з ініцыятывай урэгуляваньня польска-германскіх адносін. Ён імкнецца вывесьці іх з тупіку і стаць на шлях згоды». Газэта падкрэсьлівае наступныя факты: «У мінулым тыдні быў выкліканы ў Варшаву пасланьнік у Берліне. Яму было тут паведамлена, што ў сувязі з апошнімі падзеямі на міжнароднай арэне, Польшча лічыць неабходным распачаць непасрэдныя перагаворы з Германіяй па актуальных палітычных пытаньнях». Шэмбэку ў часе яго паездкі ў Парыж і ў Лёндан было даручана выясьніць настрой і азнаёміцца з думкамі францускага і англійскага ўрадаў з прычыны польскае ініцыятывы. «У гутарках польскіх дыплёматаў аб Берліне,—працягвае «Глос паранны»,—былі закранутыя пытаньні аб германскім патрабаваньні раўнапраўя ва ўзбраеньнях, аб польска-данцыскіх адносінах, скаргах нямецкай нацыянальнасьці ў Польшчы, а таксама аб праблеме польска-германскіх гаспадарчых адносін». «Глос паранны» падкрэсьлівае вядомую супярэчнасьць у ацэнцы берлінскіх гутарак польскім і германскім банкамі. Польскія колы да апошняга моманту імкнуліся надаць супярэчы Шэмбэка і Бэка з германскімі дыплёматамі, як акт міжнародняй палітычнасьці. У той жа час германскае міністэрства замежных спраў апублікавала паведамленьне, у якім таворыцца, што паводле зобнага пажаданьня польскага ўраду, вымест берлінскіх гутарак захоўваецца ў тайне.

Ліга нацый

Закулісныя перагаворы

ЖЭНЭВА. 24-XI. (Спец. кар. ТАСС). Сёньня працягваліся закулісныя перагаворы вакол пытаньня аб вароте Германіі на канфэрэнцыю па разбраеньні. Асноўныя гутаркі адбываліся паміж **Саймонам і Поль Бонкурам** і паміж **Саймонам і Нэйратам.**

У перагаворах зноў сутыкаліся германскае патрабаваньне аб папярэднім прызнаньні Францыяй прынцыпу роўнапраў'я ва ўзбраеньнях і францускае патрабаваньне аб тым, каб вытаць не аб роўнапраўі абмяркоўвался толькі ў сувязі з праблемай бясьпечнасьці.

Для таго, каб абмінуць затрудненьні, Саймон, як відаць, па згодзе з Нэйратам, Дэвісам і Поль Банкурам, высунуў прапанову, каб замест канфэрэнцыі наладзіць у хутчэйшым часе сустрэчу пяці дзяржаў. З германскага боку, паступіла згода пайсьці на такое спатканьне без папярэдніх умоў, але з захаваньнем свабоды дзеяньняў.

У англійскіх колах лічаць, што дасягнуты пэўны зрух у перагаворах, але думаюць, што магчымасьць скліканьня канфэрэнцыі пяці дзяржаў далёка яшчэ не забясьпечана, падкрэсьліваючы гэтым самым, што галоўнай перашкодай у сучасны момант зьяўляецца выстаўленьне папярэдніх умоў з францускага боку.

Шанхайскія арганізацыі супроць японскае агрэсіі

ЖЭНЭВА. 26-XI. Кітайская дэлегацыя разаслала членам Лігі нацый паведамленьні аб рэзалюцыях, вынесеных шанхайскімі і іншымі гандлёва-прамысловымі арганізацыямі, якія патрабуюць ад Лігі нацый устанаўленьня справядлівасьці і прыняцьця мер супроць японскай агрэсіі.

Са старонак замежнага друку

У Варшаве ядуць сабачае мяса

Пад такім загалоўкам буржуазны «Дзеньнік Віленскі» у № 288 падае за метку аб тым, што «Ліга Прыяцеляў жывёлы» у Варшаве доўгі час атрымлівала весткі аб тым, што у Варшаве і Лодзі ядуць сабачае мяса і прадаецца сабачы шмалец.

Адпойчы ў пачы быў учынены вобыск у доме № 62-64 на Элекцыйнай вуліцы, у якім нібы была бойня сабак, для мэтаў харчаваньня сабачым мясам.

Апісваючы рэвізію газэта зазначае, што «асаблівую зацікаўленасьць рэвідэнтаў (рабіўшых рэвізію) выклікаў гаршчок у кухні ў якім нешта гатавалася. Калі ў гаспадыні запыталіся, што гэта за маса гатуецца ў гаршку, прастадушная жанчына прызналася, што гэта сабачае мяса, а бачачы агіду на тварах сабраных, падыйшла да гаршка, вынула з яго сабачыя рэбры і на вачох ўсіх пачала іх грызьці, гаворачы, што сабачае мяса ня толькі смачнае, але здаровае і спажывчае.

Жанчына прызналася, што харчуецца сабачым мясам з доўніх часоў і ведае шмат асоб, якія робяць гэта-ж самае».

***

Паводле паведамленьня сацыял-фашысцкага «Работніка» на 1 лістапада г. г. у гарадзкіх прытулках для бясьпрытульных жыло агулам **4358 сем'яў**, У агульнай колькасьці **18455** асоб, на 1-га студзеня 1931 г. бясьпрытульных налічвалася **3817** сем'яў з колькасьцю 15745 чалавек.

***

ВАРШАВА. 12 лістапада Варшаўскі магістрат распусьціў будаўнічы аддзел электрастанцыі, з прычыны чаго 500 рабочых выкінута на брук.

Большасьць каналізацыйных і водаправодных фабрык у Польшчы спыняюць працаваць з 1-га сьнежня г. г. З прычыны закрыцьця гэтых фабрык каля 1500 рабочых застаюцца беспрацоўнымі.

***

Будаўнічыя прамыслоўцы горнага Шлёнску патрабавалі зьніжэньня зарплаты рабочых на 50 проц. Рабочыя гэтыя патрабаваньні адхілілі.

***

У фабрыках «Шона» і «Тэмпс», у Дамброўскім басэйне, працягваецца забастоўка рабочых, якую яны абвясьцілі з прычыны значнага зьніжэньня зарплаты.

Па Саюзе ССР

▲ Рэспубліка немцаў Паволжжа, МТС Сярэдняй Волгі і 40 раёнаў Заходняй Сібіры датэрмінова выканалі гадавы плян збожжазагатовак.

▲ 25-XI у Маскве ў калённай залі Дому саюзаў адкрыўся V Усесаюзны зьезд інжынэраў і тэхнікаў. Зьезд сустадае з 10-м УсеМБІТ.

▲ МАСКВА. На тэрыторыі заапарку адкрылася выстаўка птушніцтва і трусагадоўлі.

▲ Скончылася 70 год са дня нараджэньня буйнейшага нямецкага пісьменьніка Гергардта ГАУПТМАНА. Да свайго юбілею Гаўптман выпусьціў новую мастацкую п'есу «Перад заходам сонца».

▲ Далучаюць свае подпісы да адозвы Усесаюзнай Акадэміі навук да усіх вучоных сьвету, акадэмікі Бах А. Н., Іоффэ А. Ф., Бурнакоў Н. С.

▲ Закрыўся пленум УсеЦСПС. Кааптаваны ў члены пленуму: старшыня УкрЦСПС—Сухамлін, заг. культмасавым сэктарам—Марчанка.

За дзьве першыя дэкады лістапада па Саюзе здабыта 1067,7 тыс. тон нафты—60,9 проц. месячнага пляну.

Сталі выплаўлены па Саюзе за першы 20 дзён лістапада 317,671 тона—74,7 проц. пляну.

▲ ХАРКАЎ 27-XI. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі на кожную тысячу насельніцтва Украіны прыпадала толькі 274 пісьменных, у 1932 г.—975. Паводле сьцьвярджэньня намесьніка Наркамасьветы УССР т. Карпенка, праз 3—4 месяцы Украіна будзе рапартаваць аб суцэльнай пісьменнасьці насельніцтва рэспублікі.

▲ ЭРЫВАНЬ 27-XI. Буйнейшы калгас Кутаіскага раёну—Гегуцкі,—адным з першых у Арменіі прыступіў да разьмеркаваньня даходаў.

На працадзень выдаецца 8 руб. грашыма і 10,2 кілё кукурузы.

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі ў паход за шырспажыў

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі Менску на сваёй канфэрэнцыі, якая адбылася 23 лістапада, абгаварылі пытаньне аб абвешчаным паходзе саветаў за рэалізацыю рашэньняў верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) па рэгортаньні вытворчасьці шырспажыву. Канфэрэнцыя інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў уключылася ў гэты паход і ўзяла на сябе рад практычных канкрэтных абавязкаў.

Інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі заявілі, што яны на сваіх прадпрыемствах стануць на чале правядзімага двухмесячніку. Яны запаўнілі ўрад і яго орган газэту «Савецкая Беларусь», што яны практычным удзелам у рацыяналізацыі вытворчасьці прымуць усе меры да максымальна-эфэктыўнага скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, адыходаў і адкідаў.

Усю тэту работу яны будуць праводзіць пры актыўным удзеле дэпутацкіх груп і рабочых мас пад кіраўніцтвам партыйных прафэсіянальных арганізацый сваіх прадпрыемстваў.

ІТР свае абяцаньні па канфэрэнцыі павінны ператварыць у жыцьцё. Нескарыстаныя рэсурсы павінны быць ператвораны ў добраякасную прадукцыю для заблясьпечаньня патрэб шырокіх працоўных мас.

Старшыні Цэнтральнай камісіі паходу саветаў т. Гнілякевічу

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“

КРУПКІ. (Па тэлеграфе). 22 лістапада на пленуме РВК раён уключыўся ва ўсебеларускі паход саветаў за шырспажыву. Створана райкамісія і выпрацавана праграма практычнага правядзеньня двухмесячніка па раёне.

Па сельсаветах праводзяцца нарады сэкцый і дэпутацкіх груп.

Крупшчына выклікала на спаборніцтва па правядзеньні паходу Талачынскі раён.

Старшыня РВК СІЛЬВЭСТРАЎ.

Кравецкая арцель „Новы Шлях“ у барацьбе за шырспажыву

Кравецкая арцель «Новы шлях» вы рабляе тавары шырокага спажываньня — гатовае адзеньне. Арцель выконвае заказы прадпрыемстваў Менску на пашыўку пікіто, касьцюмаў і інш.

Двухмесячнік паходу за шырспажыву аднадушна ўхвалены краўцамі. Краўцы ўключыліся ў абвешчаны паход і вызначылі ряд практычных мер прыемстваў па ажыцьцяўленьні пастановы ўраду БССР.

Адкрыты заготоўчы пункт старой і паношанай вопраткі, якая краўцамі перапрацоўваецца і выкідваецца на калгасны базар адноўленым адзеньнем. Гэтым самым праводзіцца барацьба са спэкулянтам і перакупшчыкамі, які імкнецца гандаль вопраткай ператварыць у сродак лёгкай наживы.

На плошчы Парыскай камуны арцель «Новы шлях» пачала пабудову вялікага ларка для гандлю таварамі з загатоўленай утыльсыравінай.

У адказ на пастанову ўраду БССР аб правядзеньні паходу за шырспажыву, краўцы бальшавікамі тэмпамі выконваюць планы па вырабе шырспажыву.

Пасьляховае выкананьне прамфінпляну арцелі «Новы шлях» — гэта новая крыніца тавараў шырспажыву на калгасным базары.

А. Кр.

Абавязкі дэпутацкай гоупы „Сьцяг індустрыялізацыі“

Мы, дэпутаты і савецкі актыў Віцебскай шэйнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», абгаварыўшы на сваім пленуме рашэньне прэзыдыуму ЦВК аб абвешчаньні двухмесячніку паходу за рэалізацыю рашэньняў верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) па вырабе тавараў шырспажыву, уключаемся ў паход і бярэм на сябе наступныя абавязацельствы:

Надаючы асаблівае важнае значэньне выкананьню прамфінпляну па ўсіх яго показьніках на нашым прадпрыемстве бярэм шэфства над адстаючым цэхам па вырабе мужчынскіх з — паліто. У гэты цэх нашай дэпутацкай групай прымацавана 7 лепшых ударкаў з савецкага актыву для аказаньня практычнай дапамогі ў выкананьні прамфінпляну. Гэтай-жа брыгадзе дэпутацкая група даручыла арганізаваць у цэху дзьве гасразьліковыя брыгады імя Віцебскага гарсавету.

Дэпутацкая група ўзяла шэфства над сампрамарцельню «Уперад» для аказаньня ёй практычнай дапамогі ў разгортваньні масавай, работы ва ўжываньні сацыялістычных форм і мэтадаў працы, арганізацыі сацпаборніцтва і ўдарніцтва, арганізацыі гасразьліковых брыгад, перанясьні лепшых вопытаў работы нашай фабрыкі ў над шэфную арцель, у атрыманьні ўтыль сыравіны і г. д. Аб гэтым паміж імі заключаны дагавор.

Для штодзённай практычнай дапамогі арцелі дэпутацкая група прымацавала да арцелі «Уперад» 5 чалавек лепшых сваіх актывістаў.

Для паладжваньня работы ў падшэфным калгасе імя Чырвонай арміі, для арганізацыі там дэпутацкай групы паслана брыгада з ліку савецкага актыву ў складзе трох . таварышоў, якім даручана арганізаваць работу па правядзеньні паходу.

Пры актыўным удзеле дэпутацкай групы фабрычная арганізацыя крыстыліі да распрацоўкі пляну другой пяцігодкі фабрыкі. Вакол гэтага пытаньня разгортваецца масавая работа сярод рабочых фабрыкі.

Дэпутацкая група фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» маючы добры актыў, армію ўдарнікаў запэўнівае партыю, ўрад і ўсю грамадзкасьць БССР, што здолеем ажыцьцявіць намечаныя ўрадам БССР мерапрыемствы па выкананьні важнейшых рашэньняў партыі аб вырабе тавараў шырспажыву.

Па даручэньні пленуму дэпутацкай групы

КУЗЬМЯНОК.

Шэфства над майстэрнямі вайсковых часьцей

Бюро вайсковай сэкцыі Віцебскага гарсавету намецілі наступныя мерапрыемствы па правядзеньні двухмесячніку паходу.

Узяць шэфства над пашывачнымі і рамонтнымі майстэрнямі вайсковых часьцей Віцебскага гарнізону, правесьці агляд іх работы і аказаць ім практычную дапамогу ў паладжваньні работы. Для гэтага вылучана спэцыяльная брыгада з 5 таварышоў, членаў сэкцыі.

Намечана правесьці агляд ЗВК у галіне праверкі абслугоўваньня імі оваіх пайнікаў і продажы тавараў у калгасных ларках.

У першай палове сьнежня месяца сэкцыя намецілі правядзеньне сходаў рабочых пашывачных і рамонтных майстэрняў вайсковых часьцей па пытаньні практычнага ўдзелу сэкцыі ў паладжваньні работы майстэрняў па вырабе прадукцыі, выкананьні пляну па колькасьці і якасьці, па аборы рацыяналізатарскіх прапаноў, скарыстаньні ўтылю і інш.

Для паладжваньня сацыялістычнай сувязі паміж сэкцыяй і калгасаў падшэфнага Замастоцкага сельсавету намечана правядзеньне сходаў калгасьнікаў па пытаньні арганізацыі калгасных базараў, заключэньне сацдагавораў паміж сэкцыяй і дэпутацкімі групамі калгасаў і паладжваньне ўсяе работы ў калгасах падшэфнага сельсавету.

Багданаў.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія спажывецкай каапэрацыі

Актыўным удзелам саветаў і прафсаюзных арганізацый

забясьпечым уцягненьне шырачайшых мас у перавыбары

Пасьледваць прыкладу Заслаўскага сельСТ

Справаздачна - перавыбарчая кампанія спажывецкай каапэрацыі па ЗАСЛАЎСКІМ раёне праходзіць як важнейшае палітычнае мерапрыемства, на якое мабілізуецца калгасныя і бядняцка - серадняцкія масы насельніцтва. Па ЗАСЛАЎСКІМ сельСТ кампанія павінна быць скончана 27 лістапада. Падрыхтоўчая работа з жанчынамі і групамі беднаты выклікала актыўны ўдзел апошніх ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі спажыўкаапэрацыі. Агульны сход жанчын калгасу «НОВЫ БУДАЎНІК», на які зьявіліся 87 проц. жанчын калгасаў, распрацавалі пастанову верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы: 1) да дню выбараў органаў спажывецкай каапэрацыі выпусьціць пры калгасе нумар насьценгазэты, прысьвечаны справаздачна-перавыбарчай кампаніі і сыстэматычна выпускаць такія газэты; 2) стварыць з ударныя брыгады па апрацоўцы лёну паміж якімі павінны быць заключаны дагаворы па сацпаборніцтве на лепшую колькасную і якасную апрацоўку і дагэрміновую здачу дзяржаве лёна - валакна. Але партыйная ячэйка і сельсавет яшчэ недастаткова ўявілі сабе важнасьць гэтай кампаніі. Настаўніцтва мястэчка ЗАСЛАЎЕ, ня гледзячы на рад паказаньняў з боку райпрафсавету аб дапамозе і мабілізацыі вучняў пінэраў, аб стварэньні брыгад кніганошаў, — ня ўдзельнічаюць у гэтай важнейшай кампаніі.

Неабходны карэнны пералом у правядзеньні справаздачна - перавыбарчай кампаніі на ўсіх сельсаветах раёну. Партыйныя, савецкія і прафесіянальныя арганізацыі павінны неадкладна прыступіць да канкрэтнага кіраўніцтва справаздачна - перавыбарчай кампаніі спажывецкай каапэрацыі:

ЛЯЎКОВІЧ:

Перабудаваць работу на хаду

ШКЛОЎ. (Наш кар.). Побач з некаторымі дасягненьнямі ў рабоце спажывецкай каапэрацыі Шклоўшчыны (та варазвароты у параўнаньні з 1931 годам узрос да 747.506 руб., узрос паявы капітал да 258.146 руб., колькасьць пайнікаў—з 17.302 да 24670) мы маем рад недахопаў.

Спажывецкая каапэрацыя Шклоўшчыны не перабудавала сваёй работы, не наблізіла краму да спажыўца, няма цеснай сувязі сельспажыўтаварыстваў з масамі пайнікаў. На працягу паўтара год ніводнае сельСТ не рабіла справаздачы перад пайнікамі.

У выніку адрыву спажывецкай каапэрацыі раёну ад мас, яна мае рад буйнейшых недахопаў у сваёй рабоце. Зусім не вядзецца работа на разгортваньні пазапляновых заготовак. З 17 сельСТ ніводнае да гэтага часу не пераключылася на самазатаўку і ўвесь упор у галіне гандлёвай работы робіцца на тавары цэнтралізаванага завозу.

Рост крамнай сеткі па раёне зусім вязначны. На працягу 1932 году гандлёвая сетка павялічылася толькі на 3 адзінкі: калі на 1 студзеня 1932 году было 38 гандлёвых кропак, дык на 1 лістапада ёсьць 41.

Гаспадарчы разьлік ня ўведзены. Замест скарачэньня адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў, мы маем бесьперапынны іх рост. Так, за 1932 год адміністрацыйна-гандлёвыя выдаткі да таваразвароту складаюць 10,7 проц. у той час, як кантрольны процант выдаткаў, у які патрэбна было ўкласьціся,—9,6 проц.

Адсутнасьць кантролю за прадаўцамі і загадчыкамі крам прыводзіць да значных растрат. Растраты займаюць «пачэснае» месца ў рабоце спажывецкай каапэрацыі Шклоўшчыны. На 1 студзеня 1932 году растраты па сельСТ складалі 4739 руб., а на 1 лістапада—12240 руб. Злоснымі растратчыкамі зьяўляюцца Чарнарускае сельСТ—мае растрат на 5012 руб., Александрыйскае—2454 руб. і Зар.-Шклоўскае—1220 руб. Трэба адзначыць, што ня райсаюз, такі і райпракуратура зусім слаба рэагуюць на зробленыя растраты.

У галіне каапэраваньня спажывецкая каапэрацыя Шклоўшчыны на працягу году мела таксама значныя прарывы. У першым квартале 1932 году плян па каапэраваньні выкананы толькі на 14,9 проц. і па пайнакапленьні—на 69,2 проц. У II квартале па каапэраваньні плян выкананы на 25,4 проц., па пайнакапленьні—на 106,2 проц., у III квартале па каапэраваньні—на 18,3 проц. і па пайнакапленьні—на 82,3 проц.

Спажывецкая каапэрацыя Шклоўшчыны вядзе зусім нязначную барацьбу за фінплян. Паасобныя сельСТ (Рыжкаўскае ды інш.) зусім бязьдзейнічаюць у гэтай галіне.

Справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ажывіць усю работу спажывецкай каапэрацыі Шклоўшчыны, павінна мабілізаваць масы пайнікаў на ліквідацыю маючыхся недахопаў.

Ул. СТРОМСКІ.

Хроніка

У Менск прыбыў прадстаўнік цэнтральнай конкурснай камісіі для азнаямленьня з ходам конкурсу друку па садзейнасьці мабілізацыі продкаў. Сёньня адбудзецца пленум Беларускай рэспубліканскай конкурснай камісіі з дакладамі прадстаўнікоў цэнтральнага і раённага друку.

▲ Закончана будаўніцтва фабрыкі-кухні для чыгуначнікаў Аршанскага вузла. Фабрыка-кухня мае 14 самастойных цэхаў. Усе працэсы работы электрыфікаваны. Прапускная здольнасьць фабрыкі—10.000 абедаў у дзень.

▲ Прыладу для штампаваньня лістоў вынайшоў старшыня зьнайшыняходзтаў Гомельскага аддзяленьня сувязі. Прылада штампуе зьнач 10 тыс. лістоў у гадзіну.

***

На імя старшыні ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОВА атрыманы ліст ад калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў Сакалінчанскага сельсавету, Расонскага раёну, у якім яны пішуць:

«Пасьля Вашага выступленьня на прэзыдыуме сельсавету з удзелам калгасьнікаў і аднаасобнікаў, адбыўся пералом у выкананьні ўсіх абавязацельстваў перад савецкай уладай. На 3 лістапада адгружана бульбы Ленінграду калгасамі **135 тон**, што складае **102** проц. пляну, аднаасобнікамі—**96** тон, што складае **103 проц.** пляну. Плян дарожнага будаўніцтва выкананы ў тэрмін.

Такія посьпехаў мы дамагліся дзякуючы правядзеньню сацыялістычных мэтадаў работы, шырокай палітычна-масавай работы пры Вашым актыўным удзеле».

***

▲ 2144 руб. ад рэалізацыі ўрадажаю мопраўскага гэктара, засеянага ў карысьць палітзьняволеных, паступіла ў ЦК МОПР'у ад ячэйкі МОПР'у калгасу «1-га мая», Віцебскага раёну.

***

▲ Беларускае Міжсаюзнае артбюро студэнцкай арганізаваць пры ЦСПСБ. Арт бюро разгарнула вялікую работу па рэалізацыі рашэньняў ЦВК аб вышэйшай і сярэдняй школе.

***

▲ За пасьляховае выкананьне плану адгрузкі бульбы Ленінграду шасьцёрка ЦК і СНК БССР прэм'ювала Аршанскі раён 5.000 руб., Касьцюковіцкі—5.000 руб. 1 Клімавіцкі раён 3.000 р. 50 проц. гэтай сумы выдаецца прамтаварамі. Грошы пераведзены ў распараджэньні раённых проек для прэм'яваньня лепшых работнікаў.

***

▲ 600 руб. унесьлі рабочыя і служачыя саўгасу «Пацелюм», Барысаўскага раёну на пабудову самалёту імя XV гадавіны Кастрычніка і выклікаі рабочых і служачых ўсіх саўгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў БССР.

***

▲ Нараду апраспэцыялістаў па пытаньні павышэньня ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі раёну склікае 3 сьнежня Менгарвайса.

***

▲ 7.000.000 руб. асыгнавана на ахову здароўя БССР у 1933 годзе.

***

▲ Новае гукавое кіно адкрылася ў Рэчыцы.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Каса ад 12 гадз.
Ад 25 лістапада — мастацкі фільм вытворчасьці саюзкіно
Чалавек застаўся адзін.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Каса з 1 г. дня
Ад 23 лістапада Мастацкі фільм
Штурман з „Прыбою“
Драма з 8 частак
Штодзённа 4 сэансы, пачатак 6, 7 гадз, 30 хв. 9, 10 гадз. 30 хв Каса ад 1 гадз. дня.

Горацкі Дзённы Рабфак імя Галадзеда пры Інстытуце Кармовых Культур і аграхіміі
АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на ТРЕЦІ курс рабфаку.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатамі і стыпэндыяй на 100 проц.
Да заяў залучаць дакумэнты, пералічаныя ў правілах прыёму для наступаючых на рабфак.
Іспыты для наступаючых адбудуцца з 15-га сьнежня 1932 г. па 1-е студзеня 1933 г у аб'ёме 7-мі годкі.
Заняткі з залічанымі пачнуцца з 15 студзеня 1933 г.
Заявы накіроўваць па адрасе:
г. ГОРКІ, БССР, РАБФАКУ імя ГАЛАДЗЕДА.
Дырэктар рабфаку КАНДРАЛЬ.

Патрэбна на сталую работу машыністка
якая ведае белмову. Зварочвацца ў ЦП Саюзу Працасьветы (Дом працы, III паверх, пакой № 13)
да кіраўніка справ, можна і па тэлефоне № 2—41.

БЕЛКАМУНБАНК паведамляе
ўсіх забудоўшчыкаў па жыльлёвым, камунальны культурна-бытавым і ведамственым будаўніцтве,
якія крэдытуюцца або фінансуюцца праз Белкамунбанк, што яны павінны НЕ ПАЗЬНЕЙ 5-га СЬНЕЖНЯ г. г. прадставіць у філіял Белкамунбанку, з якім яны заключылі дагавор. зьвесткі па форме № 5-а і па камунальных пабудовах (водаправоду, каналізацыі, аўтагуж транспарту і інш.) па форме № 5-б аб становішчы будаўніцтва на 1-XII г. г.
Забудоўшчыкам, якія не прадставяць тэрміну паказаных зьвестак, будзе спынена крэдытаваньне і яны на будуць упесены у сьпіс пераходзячага будаўніцтва на 1933 год.
Белкамунбанк

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ
29 XI-32 г. а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Гарсавету (Вялік. зала)
АДБУДЗЕЦЦА
зьлёт дэпутатаў і сэкцыянэраў Менгарсавету
Парадак дня:
1) Аб двухмесячніку паходу сэкцый і дэпутацкіх груп у галіне вырабу тавараў шырокага спажываньня (дакладчык т. КАРАНЕЎСКІ).
2) Інфармацыя з мест ад фабрык, заводаў, дэпутацкіх груп і члена Савету 1 ад усіх кіраўнікоў арцелей аб выкананьні пляну вырабу тавараў шырокага спажываньня.
Яўка ўсіх дэпутатаў, сэкцыянэраў Гарсавету і старшынь арцелей абавязкова.
Арг. Масавы Аддзел Менгарсавету

Лужаньянскі лёнакамбінат-пляводны тэхнікум працягвае прыём на 1-шы курс
тэхнікуму з ведамі 6-7 груп і на 6-месячныя лёнактыпляводныя курсы 3-5 груп. Стыпэндыя на тэхнікуме ад 25-90 руб. і на 6-месячных курсах—50 рублёў. 100 процантнае забясьпечаньне інтэрнатам. Пры тэхнікуме ёсьць сталоўка. Заняткі па усіх курсах тэхнікуму і на курсах пачаты 19 кастрычніка. Адрас: г. Віцебск (9 кілём. на Гар доцкім шасэ) Лужаньянскі лёнакамбінат-пляводны тэхнікум.

Расшукваецца
Раман Хвядосаў Кавальскі
(47 год). Ведаючых яго месцазнаходжаньня просьба паведаміць па адрасе: Пухавіцкі раён, Рудзенскі сельсавет, в. Карапева, Юстыне Кавальскай.

Пэнсійная кніжка, выд. Менстрахкасай—Кукес А. Г., кв. 1781.

Партыйна—кандыдацкі білет, выд. Менгаркомам, 63912—Такарсук Н. К., кв. 1783.

Парт-кандыдацкі білет, выд. Менгаркомам, 48647—Пжык Е. П., кв. 1784.

Парт-кандыдацкі білет, выд. Менгаркомам, 55639—Юрлевіч І. К., кв. 1785

Пасьведчаньне аб камандыроўцы выд. Гідромэлінстытутам БССР, 544—Нагэрава Х. І. кв. 1786.

Партбілет выд. Кіеўскім гаркомам за 1165677—Слуцкі П. Я., кв. 1787.

Партыйна-кандыдацкі білет, выд. Менгаркомам, 55632—Севярынец Н. В., кв. 1788.

Пэнсійная кніжка, выд. Менстрахкасай—Патанович Д. Ф., кв. 1789.

Паляўнічы білет, выд. Менскім саюзам паляўнічых—Бараўскі Л. Н., кв. 1790.

Асоб. пасьведчаньне выд. 14-м пагранатрадам—Віткаў Х. Л., кв. 1791.

Квіт аб здачы на папраўку гадзіньніка—Валепт Д. У., кв. 1792.

Партбілет выд. Менгаркомам, 0817286—Пісоўскі М. Г., кв. 1793.

Камсамольскі білет выд. Менгаркомам—Гальперын Я. Н., кв. 1794.

Друкарня імя СТАЛІН